# Берасцейскі ўніверсітэт

Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна

ВЫДАВЕЦ: установа адукацыі «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА»
**Выдаецца з 1997 года**

**№ 10 (130)**
Выходзіць 2 разы ў месяц
на беларускай і рускай мовах
11 лютага 2010 года


## Сёння ў нумары:


**Дыплом уручаецца**
27 студзеня прайшоў першы ў гэтым годзе Савет універсітэта
стар. 2

**Аб выніках працы філіялаў кафедр**
На гэты конт выказваецца старшыня навукова-метадычнага савета універсітэта, дырэктар ІПК і ПКРС Ст.Р. Рачэўскі
стар. 3

**Прадметная размова**
Шмат гасцей сустракаў 26 студзеня інтэрнат № 4. Што іх туды прывяло? Аб гэтым на
стар. 4

**Парада псіхолага**
Вітайце новую рубрыку, што чакае вас на
стар. 5

**Гаспадыні кальца**
Студэнтка факультэта замежных моў М. Вакульчык мае на ўвазе баскетбалістак клуба «БрДУ – ЦАР «Вікторыя»
стар. 6

**Дзе яны цяпер?**
Вам прапануецца яшчэ адна рубрыка – аўтарскі праект студэнткі юрфака М. Краўчук
стар. 7


# ПЕРАМАГЛІ Ў БІТВЕ, ПЕРАМАГЛІ Ў ВАЙНЕ

***Сёлета Беларусь разам з іншымі краінамі былога СССР адзначае 65-ю гадавіну Вялікай Перамогі. 2 лютага 1943 года ход падзей у Вялікай Айчыннай, ды і ў Другой сусветнай, вайне ў значнай ступені прадвызначыла перамога ў Сталінградзе (сучасны Валгаград). Успомніць тыя гераічныя моманты, падзяліцца перажытым са студэнтамі прыйшлі 5 лютага ў канферэнц-залу БрДУ імя А.С. Пушкіна ўдзельнікі і відавочцы Сталінградскай бітвы.***

***«Кроў, ноч, бамбёжка. Хто крычыць, хто проста маўчыць і нічога сказаць не можа», – так расказвалі ветэраны пра людскія пакуты падчас знакамітага на ўвесь свет змагання.***

***Рака часу цячэ, нішто не стаіць на месцы – растуць новыя гарады, новыя пакаленні, новы свет. Лепшы свет. Жах застаўся ззаду, усё светлае толькі наперадзе. Так хацелася запэўніць у гэтым тых, хто не шкадуючы сябе ваяваў за сваю будучыню і будучыню наступных пакаленняў.***



## ШТО Ў СВЕЦЕ?

# ИНФОРМАЦИОННАЯ МОЗАИКА

Президент Беларуси Александр Лукашенко подписал указ о мерах по совершенствованию использования белорусского интернета. Согласно документу, интернет-провайдеры обязаны теперь идентифицировать абонентские устройства доступа и хранить не только эти данные, но и сведения об оказанных интернет-услугах. Кроме того, по просьбе пользователя провайдеры обязаны ограничить его доступ к экстремистским, порнографическим материалам, а также сайтам, пропагандирующим жестокость и насилие или содействующим незаконной миграции и торговле людьми. Большая часть указа вступает в силу 1 июля 2010 года.

• • •

12 февраля в Ванкувере состоится церемония открытия XXI зимних Олимпийских игр.

Их символом стала статуя Иланаак (её графической изображение на фото), оригинал которой стоит на берегу Английского залива в Ванкувере. Зелёный, синий и голубой цвета символизируют леса, горы и океан, красный означает цвет кленового листа, расположенного на флаге Канады, а жёлтый – цвет восходящего солнца.



В отличие от традиционной чашеобразной формы олимпийского факела, организаторы зимних Олимпийских игр в Ванкувере совместно с аэрокосмической корпорацией Bombardier создали совершенно новый тип факела, извергающего пламя в форме флага.

Для Олимпиады было изготовлено 615 медалей ручной работы. В отличие от большинства своих предшественниц, ванкуверские олимпийские медали не плоские, а изогнутые: создателей вдохновляли волны Тихого океана, а также снежные просторы и горные пейзажи Британской Колумбии.

Девиз Олимпийских игр – 2010 на двух языках – With Glowing Hearts / Des plus brillants (С пылкими сердцами) – размещён на сине-зелёной медальной ленте. Каждая такая лента может выдержать до 90 кг веса.

## ПАДЗЕЯ

# ДЫПЛОМ УРУЧАЕЦЦА...

**27 студзеня прайшоў першы ў гэтым каляндарным годзе, прымеркаваны да Дня беларускай навукі Савет універсітэта, на якім падводзіліся вынікі навуковай, вучэбна-метадычнай ідэалагічнай і выхаваўчай працы кафедраў універсітэта за 2009 год. Падвядзенне ж вынікаў на студзеньскіх Саветах універсітэта па традыцыі ідзе ў пары з узнагароджаннем тых, хто вылучыўся ў мінулым годзе ў той ці іншай сферы дзейнасці alma mater.**



За поспехі ў навукова-даследчай працы дыпломы атрымалі прафесар кафедры геаграфіі Беларусі М.А. Багдасараў (на фота), прафесар кафедры філасофіі Б.М. Ляпешка і прафесар кафедры рускай і беларускай моў з методыкай выкладання В.І. Сянкевіч.

У галіне вучэбна-метадычнай, ідэалагічнай і выхаваўчай працы вызначыліся старшы выкладчык кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання І.І. Глебік, дацэнт кафедры педагогікі А.Ф. Сівашынская і дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Ст.Р. Рачэўскі.

Сярод кафедраў лепшымі ў навукова-даследчай працы сталі кафедра беларускага літаратуразнаўства (загадчык З.П. Мельнікава), культуралогіі (У.П. Люкевіч) і ўсеагульнай гісторыі (А.В. Машчук), а ў вучэбна-метадычнай, ідэалагічнай і выхаваўчай працы – кафедра тэарэтычнай фізікі і астраноміі (загадчык У.С. Секяржыцкі), педагогікі пачатковага навучання (Т.В. Нічышына) і кафедра тэорыі і методыкі фізічнага выхавання (А.А. Зданевіч).

У рэйтынгу факультэтаў на лідэрскіх пазіцыях апынуліся філалагічны, гістарычны і геаграфічны факультэты; В.А. Фелькіна, Н.П. Галімава і У.І. Бойка – дэканы факультэтаў – атрымалі дыпломы з рук рэктара М.Э. Часноўскага.

На Савеце універсітэта таксама афіцыйна падведзены вынікі універсітэцкіх конкурсаў: на лепшую метадычную апрабаваную распрацоўку мерапрыемства ідэалагічнага і выхаваўчага характару і «Майстар практычных заняткаў». У мінулым нумары «Берасцейскага універсітэта» мы віншавалі пераможцаў і намінантаў апошняга з названых конкурсаў, тут жа засяродзім увагу на выніках першага.

Дыплом І ступені атрымаў калектыў аўтараў (загадчык Т.А. Кавальчук, дацэнт В.А. Іванова, дацэнт І.Г. Матыцына, дацэнт М.П. Міхальчук, старшы выкладчык Н.М. Шацкая – усе прадстаўляюць кафедру педагогікі) фестывалю «На шляху да педагагічнага майстэрства»; дыплом ІІ ступені – у калектыва аўтараў адкрытага універсітэцкага конкурсу аратарскага майстэрства «Майстар слова», выкладчыкаў кафедры агульнага і рускага мовазнаўства (загадчык В.Б. Пераход, старшы выкладчык А.А. Пасохін і дацэнт Г.В. Пісарук); два дыпломы ІІІ ступені перайшлі да выкладчыкаў кафедры методыкі выкладання матэматыкі – аўтараў конкурсу па спецыяльнасці «Мая прафесія – настаўнік» (загадчык кафедры Т.В. Піваварук, дацэнт М.А. Калавур) і да выкладчыка кафедры англійскай мовы з методыкай выкладання Ю.В. Бякрэевай (відэалуб «Cinema, cinema»). Дыпломы атрымалі таксама ўсе намінанты конкурсу.

Варта адзначыць, што сярод іншых рашэнняў студзеньскага Савета універсітэта была пастанова працягваць правядзенне прафесійных конкурсаў сярод выкладчыкаў.

**І. Хоміч**

ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ

# Аб выніках працы філіялаў кафедр

**У БрДУ імя А.С. Пушкіна функцыянуе 27 філіялаў кафедраў, адкрытых у школах, цэнтрах, дашкольных установах і Пінскім каледжы універсітэта.**

Праца выкладчыкаў у філіялах у 2009 г., аналіз выканання адпаведных планаў і прадстаўленых у рэктарат справаздач даюць магчымасць адзначыць наступнае.

Прыкметна павялічылася, у параўнанні з 2008 г., група філіялаў, у якіх кафедрамі разгорнута рознабаковая і сістэмная праца, накіраваная як на павышэнне ўзроўню практыкаарыентаванага навучання студэнтаў, так і на інтэнсіфікацыю навукова-даследчай, творча-педагагічнай, інавацыйнай дзейнасці выкладчыкаў універсітэта і педагогаў пазауніверсітэцкіх устаноў (філіялы кафедраў педагогікі, педагогікі дзяцінства, агульнага і рускага мовазнаўства, методыкі выкладання матэматыкі, методык дашкольнай адукацыі, псіхалогіі развіцця, геаграфіі Беларусі, англійскай мовы з методыкай выкладання, замежных моў другой спецыяльнасці, класічнай і сучаснай замежнай філалогіі, тэорыі і методыкі фізвыхавання).

Курс менавіта на рознабаковую і сістэмную працу ўзяты з першых дзён нядаўна адкрытымі філіяламі кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі (загадчык – дацэнт С.С. Клундук) і кафедры сацыяльна-медыцынскіх дысцыплін (загадчык – дацэнт Л.А. Сілюк).

Паспяховая, па розных напрамках праца выкладчыкаў універсітэта і школьных педагогаў праводзіцца на базе выбранай для філіяла кафедры педагогікі (загадчык – дацэнт В.А. Іванова) гімназіі № 6 г. Брэста. Тут праведзены рэгіянальная навукова-практычная канферэнцыя па праблемах здароўя сучасных школьнікаў; гімназістам і настаўнікам кафедрай аказана дапамога ў падрыхтоўцы дакладаў на навуковыя канферэнцыі абласнога і рэспубліканскага ўзроўню; адбылося ўкараненне распрацаванай кафедрай методыкі дыягнасціравання даследчых кампетэнцый настаўнікаў і вучняў, а таксама – удасканаленай методыкі правядзення педсаветаў у гімназіі; педагагічнаму калектыву начытаны цыкл лекцый па актуальных праблемах сучаснай педагогікі, для гімназістаў 8–11 класаў выкладчыкамі чытаецца факультатыўны курс «Юны даследчык» і інш.; вопыт працы ў гэтым філіяле асвятляўся на старонках малатыражнай газеты «Берасцейскі універсітэт» і «Настаўніцкай газеты».

У філіяле кафедры агульнага і рускага мовазнаўства (на базе гімназіі № 4 г. Брэста) дацэнт Г.В. Пісарук (загадчык) арганізавала правядзенне студэнтамі фрагментарных метадычных эксперыментаў у галіне развіцця маўлення вучняў, апрабацыю рукапісу вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў-філолагаў, вывучэнне гімназістамі электыўнага курса па складаных пытаннях рускай мовы, выкананне і апублікаванне вынікаў навукова-метадычнага праекта «Моўны партрэт слова» і інш.

Звяртае на сябе ўвагу выбар разнастайных форм і метадаў працы ў філіяле кафедры методык дашкольнай адукацыі (загадчык – дацэнт А.І. Мельнік): семінар-практыкум для выхавацеляў яслі-сада № 31 г. Брэста, круглы стол, выстава экалагічных плакатаў, тэатралізаванае прадстаўленне для дзяцей і лялечны спектакль, арганізаваныя студэнтамі, дабрачынная акцыя і інш.

Прапанавана абмеркаваць вынікі працы ў філіялах на пасяджэннях адпаведных кафедраў і саветаў факультэтаў.

*Ст.Р. Рачэўскі (старшыня НМС універсітэта, дырэктар ІПК і ПКРС)*

# НАШЫ НАВІНЫ

***Напрыканцы 2009 года выйшла распаражэнне прэзідэнта А.Р. Лукашэнкі «Аб назначэнні стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным на 2010 год».***

***Спецыяльныя стыпендыі ў гэтым годзе будзе атрымліваць 91 чалавек, у тым ліку 25 работнікаў Міністэрства адукацыі. Нам прыемна канстатаваць, што сярод іх ёсць і прадстаўнікі БрДУ імя А.С. Пушкіна – прафесар кафедры беларускага літаратуразнаўства Іна Анатольеўна Швед і старшы выкладчык кафедры анатоміі, фізіялогіі і бяспекі чалавека Міхаіл Васільевіч Галавач. Віншуем!***

***Нагадаем, кандыдатамі на атрыманне стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для маладых вучоных могуць стаць дактары навук ва ўзросце да 45 год, кандыдаты навук ва ўзросце да 35 год і вучоныя без ступені ва ўзросце 30 год.***

**26 студзеня адбылося пасяджэнне каардынацыйнага савета па ідэалагічнай і выхаваўчай працы універсітэта «Аб метадычным забеспячэнні ідэалагічнай і выхаваўчай працы ў БрДУ імя А.С. Пушкіна».**

На савеце выступілі начальнік аддзела выхаваўчай працы з моладдзю Т.М. Кошык, намеснік дэкана па выхаваўчай працы філалагічнага факультэта Н.У. Каладзюк (на фота) і куратар акадэмічнай групы на матэматычным факультэце А.С. Кот.

Прарэктар па выхаваўчай і сацыяльнай працы Л.А. Гадуйка, якая падвяла вынікі працы савета, скіравала ўвагу на неабходнасць пастаяннай самаадукацыі і самаўдасканалення ўсіх удзельнікаў выхаваўчага працэсу .

Вёў пасяджэнне першы прарэктар К.К. Красоўскі.

ФОТАФАКТ



РЭФЛЕКСІЯ

# ПРАДМЕТНАЯ РАЗМОВА

**Інтэрнат № 4 прымаў 26 студзеня гасцей – намеснікаў дэканаў па выхаваўчай працы, спецыялістаў студэнцкага клуба і аддзела выхаваўчай працы з моладдзю, якія сабраліся, каб прааналізаваць вынікі маніторынгу маральна-псіхалагічнага клімату і якасці выхаваўчай працы, што праводзіўся ва ўсіх інтэрнатах універсітэта, а таксама з дапамогай спецыялістаў псіхалагічнай службы набрацца творчага натхнення на працу са студэнцкай моладдзю ў другім семестры.**



У маніторынгу, што праводзіўся сацыяльна-педагагічнай службай аддзела выхаваўчай працы з моладдзю, прымалі ўдзел 178 студэнтаў трох інтэрнатаў універсітэта.

Не выклікае асаблівага здзіўлення, што на пытанне «Што прываблівае вас у інтэрнаце?» прагматычныя студэнты ў большасці сваёй адказалі, што «невысокая плата за навучанне», аднак вялікі працэнт і адказаў тыпу «Мажлівасць жыць з равеснікамі», «Магчымасць многаму навучыцца», «Узаемадапамога» і г.д. На супрацьлеглае пытанне анкеты «Што не падабаецца вам у інтэрнаце» самым папулярным адказам быў такі – «Дрэнны стан бытавых памяшканняў». Такога меркавання прытрымліваецца 73,2% жыхароў інтэрната № 2, 56,8% – інтэрната № 3 і 15,3% – інтэрната № 4.

Ацэньваючы ступень уплыву выхаваўчай працы на фарміраванне сваёй асобы, студэнты пераважна прызнаваліся, што ў «пэўнай ступені» падобная праца ўсё ж уплыў аказвае. Выхавацелям інтэрната № 2 павінна быць прыемна, што навучэнцы – жыхары менавіта гэтага інтэрната амаль на 20% перакананы, што на іх асобы выхаваўчая праца ўплывае «значна».

Цікавыя статыстычныя дадзеныя атрымалі і ў дачыненні да арганізацыі грамадскага харчавання універсітэта. Паслугамі сталовак, калі верыць апытанню, карыстаюцца 77,3% юнакоў і 47% дзяўчат. Пры гэтым прыкладна напалову раздзяліліся ў меркаваннях тыя, хто цалкам задаволены арганізацыяй харчавання ў alma mater, і тыя, хто «не задаволены часткова або поўнасцю».

Істотнае месца ў праграме семінару заняў псіхалагічны блок, калі ўдзельнікі мерапрыемства прыняліся лавіць усімі фібрамі душы станоўчыя эмоцыі пры дапамозе арт-тэрапіі (на фота). Лёгкае недаўменне і жартлівыя кпіны наконт таго, што робіць у зале вялікая колькасць парожніх бутэлек, змянілася прыхільнымі водгукамі – аказалася, што бутэлькі гэтыя трэба размалёўваць. Вось тут і выявілася, наколькі дарослыя людзі ў глыбіні душы застаюцца дзяцьмі! Абавязкова паспрабуйце самі правесці дома такі сеанс творчай тэрапіі.

У сукупнасці ж абедзве часткі семінару сталі для яго ўдзельнікаў добрай нагодай для роздумаў. Маніторынг маральна-псіхалагічнага клімату і якасці выхаваўчай працы толькі тады і карысны, калі пасля яго вынікі ўлічваць у практыцы. Ды і педагогі-псіхолагі, думаецца, не проста прыйшлі пацешыць спецыялістаў універсітэта: яны не толькі дапамаглі апошнім з патрэбным настроем увайсці ў насычаны падзеямі другі семестр, але і ўзброілі новымі магчымымі формамі працы са студэнтамі.

І. Хоміч

# НАШЫ НАВІНЫ

***29 студзеня прайшоў адзіны дзень інфармавання для работнікаў універсітэта «Прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь», на якім з дакладам выступіў прафесар кафедры тэарэтычнай і прыкладной эканомікі А.В. Чарнавалаў.***

● ● ●

***4–5 лютага ва універсітэце адбылася міжнародная канферэнцыя «Параўнальная педагогіка ва ўмовах міжнароднага супрацоўніцтва і еўрапейскай інтэграцыі», арганізатарамі якой выступілі кафедры педагогікі і замежных моў. У канферэнцыі прынялі ўдзел выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, Балгарыі, Польшчы, Расіі і Украіны.***

● ● ●

***Віншуем народны вакальны ансамбль «Новая зямля» (мастацкі кіраўнік Л.І. Борсук), які стаў дыпламантам XV Міжнароднага фестывалю ўсходнеславянскіх калядных песняў (29 студзеня – 1 лютага, Польшча)!***

● ● ●

***22 лютага адбудзецца адкрыты універсітэцкі конкурс чытальнікаў «Таямніцы слова і думкі». Конкурс традыцыйна пройдзе ў два аддзяленні – аўтарскае і выканаўчае. Да ўдзелу запрашаюцца студэнты рэгіянальных універсітэтаў і навучэнцы гімназій і ліцэяў Брэста. Кансультацыя-праслухоўванне будзе наладжана для ўдзельнікаў 17 лютага.***

***Па ўсіх пытаннях звяртайцеся ў дэканат філалагічнага факультэта або ў аддзел выхаваўчай працы з моладдзю (каб. 413 вуч. корпуса № 1).***

● ● ●

***13 лютага 75-гадовы юбілей святкуе Пінскі каледж установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна». Многія яго выпускнікі сталі студэнтамі і выкладчыкамі нашага універсітэта. Віншуем усіх іх з Днём нараджэння першай alma mater!***

## ПАРАДА ПСІХОЛАГА

***Дорогие читатели! Мы рады представить вам новую рубрику «Парада псіхолага». Специалисты психологической службы университета охотно дадут вам нужный совет, помогут разобраться в ваших проблемах. Пишите нам в редакцию по электронному адресу gazeta_brsu@brsu.brest.by или приходите в каб. 415 учебного корпуса № 1.***

**«Проблема: тяжело вставать утром на работу. Подскажите, как заставить себя выползти из постели вовремя, да так, чтобы ещё и позавтракать успевать?»**

Нелёгкому пробуждению по утрам есть несколько объяснений. Климатическая и сезонная обусловленность нашей жизнедеятельности: короткий день и длинная ночь, большая разница температур в помещении и на улице. Наши индивидуальные биоритмы – «жаворонок» или «сова». А также причины, связанные с нашей деятельностью: собственное отношение к работе (степень удовлетворённости или неудовлетворённости), климат рабочей обстановки (уютный или неуютный, развивающий или угнетающий). Проанализировав каждую из перечисленных причин, Вы найдёте ответ на свой вопрос.

И ещё несколько предложений:

– не экономьте на отдыхе (полноценный здоровый сон, водные процедуры, время для себя) и питании (скажите «нет» перекусам, не забывайте о витаминах);

– с вечера готовьте «рабочий портфель и одежду»;

– спать укладывайтесь с хорошими мыслями (не решайте проблемы на ночь глядя);

– просыпайтесь под приятную для Вас мелодию (в наше время технически это возможно);

– добавьте уюта в рабочую обстановку (фотография на столе, любимая ручка, приятный блокнот, цветок на подоконнике – всё то, что поднимает Вам настроение и радует);

– создайте свою формулу успеха с учётом личного опыта и пользуйтесь ею почаще.

*Н.Г. Ковальчук*
*(педагог-психолог ПС)*

## ЛЮТЫ Ў ГІСТОРЫІ

*01.02.1865 г. – у ЗША адмененае рабства;*

*02.02.1665 г. – горад Нью-Амстэрдам перайменаваны ў Нью-Йорк у гонар новага ўладальніка – герцага Йоркскага;*

*02.02.1970 г. – у мюнхенскай клініцы ажыццёўлена першая перасадка нерва чалавеку;*

*03.02.2005 г. – у Кітаі выпускаецца самая дарагая ў свеце газета. Адмысловы выпуск Economic Daily надрукаваны на залатой паперы. Кошт асобніка газеты складае 8 тысяч долараў;*

*6.02.1971 г. – амерыканскія астранаўты Алан Шэпард і Эдгар Мітчал выходзяць на паверхню Месяца;*

*7.02.2006 г. – да Паўднёвага полюсу накіроўваюцца ўдзельнікі першай беларускай антарктычнай экспедыцыі;*

*8.02.1838 г. – Сэмюэл Морзэ дэманструе сістэму электрамагнітнага тэлеграфу;*

*8.02.1879 г. – інжынер-чыгуначнік Сенфард Флемінг прапаноўвае ўжываць універсальны час, падзяліўшы зямны шар на 24 гадзінных паясы;*

*10.02.1996 г. – суперкамп'ютар IBM Deep Blue перамог Гары Каспарава;*

*11.02.1922 г. – канадскі вучоны Фрэдэрык Грант Банцінг абвясціў пра адкрыццё інсуліну. На наступны год яму будзе ўручана Нобелеўская прэмія;*

*12.02.1959 г. – адкрыты Дзяржаўны цырк БССР.*

## АКТУАЛЬНА

# НЕТ СКВЕРНОСЛОВИЮ



**В декабре 2009 года на психолого-педагогическом факультете стартовал проект «Нет сквернословию» (в рамках университетского конкурса студенческих социальных проектов по профилактике вредных привычек «Всё в наших руках»).**

О том, что проблема употребления ненормативной лексики на психолого-педагогическом факультете существует, свидетельствует проведённое нами анкетирование студентов 1–3 курсов. Его данные показали, что 76% студентов употребляют бранные слова редко, 5% – каждый день и лишь 5% не используют вообще.

На вопрос «В каких именно ситуациях Вы употребляете нецензурные слова?» 35% опрошенных студентов ответило, что используют брань в ситуациях повышенной злости, 28% – в ситуациях конфликта, 19% – при раздражении, 10% – в стрессовых ситуациях, 8% – когда что-то не получается.

Представляют интерес ответы студентов, не употребляющих или редко употребляющих бранные слова. На вопрос «От кого Вы чаще всего слышите подобные слова?» 25% респондентов ответили «От лиц мужского пола»; 15% – «От подростков». Встречались и такие ответы: «От людей, находящихся в нетрезвом состоянии», «От незнакомых», «От сверстников».

Чтобы попытаться выявить причины употребления ненормативных слов, мы предложили ответить на соответствующий вопрос студентам. 36% опрошенных считает, что таким образом люди стремятся показать своё превосходство над другими, 24% – что их употребляют для выражения эмоций, 16% студентов предполагает, что люди просто не находят других слов, 14% – что «это привычка», 10% – что ругательства используют для связки слов.

Анализ данных подтверждает тот факт, что для ругательных выражений характерен не смысл, а эмоциональное содержание, причём одно и то же слово может отображать весьма разнообразные психические состояния. Чем менее точно человек способен передать свои переживания, тем чаще он будет прибегать к универсальным суррогатным обозначениям.

Вызывает интерес, что 98% опрошенных считает, что употреблять нецензурную лексику плохо. 26% респондентов признаётся, что во время произношения бранных слов чувствует стыд и неудобство, у 8% употребление ругательств вызывает чувство вины. Это говорит о готовности студентов бороться со сквернословием.

Поэтому в течение декабря на своём факультете мы провели акцию «Уничтожение нецензурных слов» (на фото), беседу со студентами 1-го курса «Словом можно спасти, словом можно убить», блиц-опрос «А что думаешь ты?»; распространили информационную печатную продукцию.

На этом наш проект не остановлен, после успешной сдачи экзаменов и короткого отдыха мы продолжим борьбу со сквернословием.

*И. Лопутко*
*(психолого-педагогический факультет)*

## ГАСЦЁЎНЯ

*Напрыканцы мінулага месяца, 30 студзеня, на веслярным канале г. Брэста прайшоў першы этап абласных спаборніцтваў па лыжным спорце «Брэсцкая лыжня», у якім удзельнічалі студэнты рэгіянальных ВНУ і прадстаўнікі сілавых структур абласнога цэнтру.*

*Прыемна канстатаваць, што каманда БрДУ імя А.С. Пушкіна ў складзе Р. Караля, П. Адамовіча, К. Апалька і К. Герасіменка заняла першае месца сярод універсітэтаў. Заўважым, што ўсе нашы спартсмены хоць і вучацца на факультэце фізічнага выхавання, не з'яўляюцца прафесійнымі лыжнікамі, а ад гэтага толькі ўзрастае вартасць заваяванай імі перамогі.*

*Прызы пераможцам забегу ўручыў старшыня аблвыканкама К.А. Сумар, які і з'яўляецца ініцыятарам «Брэсцкай лыжні».*

*Арганізатар мерапрыемства – упраўленне фізічнай культуры, спорту і турызму Брэсцкага аблвыканкама.*

# Хозяйки кольца

**Спорт – дело благородное. И жёсткое. Для того чтобы выжить на этом поприще, нужно самозабвенно работать над собой. Не каждый решится на такой подвиг. Но люди, о которых пойдёт речь, не побоялись трудностей и пошли по этому нелёгкому пути.**

Женский баскетбольный клуб «БрГУ – ЦОР «Виктория» начал своё существование в 2006 г., когда вышел Указ Президента Республики Беларусь о создании спортивных клубов. В нашем университете наиболее перспективным видом спорта для такой деятельности показался баскетбол.

Председатель клуба – ректор М.Э. Чесновский, исполнительный директор – декан факультета физического воспитания Н.И. Приступа, тренер-администратор – А.М. Курилик, главный тренер – старший преподаватель кафедры спортивных дисциплин М.М. Курилик.

Для того чтобы поподробнее узнать о жизни клуба, мы решили обратиться к М.М. Курилику.

**– Михаил Михайлович, скажите, кто входит в состав команды?**

– Заявленных у нас 15 человек. Но, кроме профессиональных спортсменов, в команде присутствуют студенты и, что может показаться для кого-то удивительным, школьницы.

**– Где и по какой системе обычно проходят соревнования?**

– Уже по традиции игры проходят в таком порядке: две игры на выезде, две дома. Тренировались мы раньше во дворце спорта «Виктория», а с недавнего времени начали тренироваться в спорткомплексе нашего университета.

**– В каких крупных соревнованиях вы участвовали в последнее время?**

– В Кубке республики (5-е место), республиканской универсиаде среди вузов Беларуси (3-е место), Чемпионате Республики Беларусь. В нём пока, после первого круга, мы занимаем 5-ю позицию.

**– А кто финансирует клуб?**

– Управление по физической культуре и спорту. Также есть несколько спонсоров: ООО «Вегас», ОАО «Брестский мясокомбинат», сельскохозяйственный производственный кооператив «Остромечево», ДС «Виктория». Многим помогает нам и руководство нашего университета.

**– Как вы поощряете особо выделившихся?**

– Вообще ведётся статистика, за всеми игроками зорко наблюдают. И для тех, кто сильно выделяется, предусмотрено премирование.

**– От кого зависит в большей степени исход игры? От тренера или игроков?**

– Знаете, есть такое выражение: 2 очка проигрывает тренер, а 20 – команда.

**– Да, ответ исчерпывающий. А как вы стимулируете свою команду?**

– Главный стимул – победа. Для настоящего спортсмена это всё. Главное – точно сориентировать людей, показать, к чему стремиться, а дальше они уж сами.

**– Как вы думаете, может ли дружить тренер с игроком?**

– (Смеётся). Конечно. Дружеские отношения в команде должны присутствовать. А часто спортсменки видят в тренере и второго отца.

**– Вы как тренер больше демократ или диктатор?**

– Я думаю, что демократ. Я всегда прислушиваюсь к мнению нашей команды. Ведь без этого никак.

**– С какими сложностями вы сталкиваетесь в последнее время?**

– Некоторые наши спонсоры перестали нас финансировать, и это уже ощущается.

**– Вы недавно заняли 3-е место в соревнованиях по баскетболу среди вузов. Какие перемены обычно происходят в команде после таких событий?**

– У команды появляется стимул работать, укрепляется её вера в свои силы, и она со свежими силами готова к покорению новых вершин.

**Ну что ж, нам остаётся пожелать: пусть подобных стимулов у клуба «БрГУ – ЦОР «Виктория» будет как можно больше!**

*М. Вакульчик (факультет иностранных языков)*



ДЗЕ ЯНЫ ЦЯПЕР?

# НАРОДНЫЙ ДИ-ДЖЕЙ

**Молодой, веселый, жизнерадостный теле- и радиоведущий и завидный жених… Знакомьтесь: выпускник факультета иностранных языков 2006 года Павел Пчёлкин!**



**– Паша, как получилось, что ты попал на радио и телевидение?**

– Да само собой как-то случилось. Ещё будучи студентом, я искал себя везде. По воле случая я попал на конкурс «Народный ди-джей». В тот день у нашей команды КВН факультета иностранных языков была репетиция, но моя девушка ультимативно *(улыбается. – Авт.)* уговорила меня пойти на прослушивание. Вот так в 2005 году я попал в телерадиокомпанию «Брест», о чём абсолютно не жалею. Моя работа – это моя жизнь: очень интересная, насыщенная, яркая и непростая. Мне важно, что есть возможность расти и развиваться. Свободного времени на какие-то личные интересы остаётся очень мало, но я не жалуюсь. Вернее, жалуюсь, но тихонько и когда никто не слышит.

**– Мечтал о чём-то подобном в детстве?**

– О нет! В детстве я мечтал стать рэкетиром! Да-да! Моё детство как раз попало на то время. Я думал, что бандиты могут всё. Потом понял, что это не так, и захотел стать космонавтом. А еще я очень хотел стать президентом мира, но пока это не сбылось.

**– Паша! Ты закончил факультет иностранных языков. Почему именно этот факультет и именно наш университет?**

– Я закончил лингвистическую гимназию в Бобруйске. В 10–11 классе стоял перед выбором: спорт или учёба. В спорте у меня были перспективы, но выбор пал на учёбу.

Что же касается выбора университета, то база знаний нашей гимназии давала возможность поступить в любой ВУЗ страны. Минск я сразу исключил, т.к. пусть это и ближе, но туда поступали почти все мои одноклассники, а мне хотелось отличиться. И я решил поступать на «Историю. Английский» в Гомель. В силу своей взбалмошности и богатого КВНовского прошлого я думал, что приеду туда, и меня там все полюбят. На первом экзамене – это была история – стал замечать, что члены комиссии не слушают меня, а обсуждают… как нужно солить огурцы! Я решил сделать им замечание. Реакции никакой. Я сделал второе замечание – и сдал историю на 3,5 баллов. Затем был Брест, подготовительное отделение нашего университета. Так и остался.

**– Ты упомянул о КВН. Начало было положено еще задолго до университета?**

– КВНом я увлёкся ещё в школе. Наша школьная команда добивалась огромных успехов! Бобруйск, Могилёв, Москва… Мы 2 года доходили до ¼ финала школьной Лиги под руководством АМИК!

А в университете я играл в факультетской команде. Жаль, до университетской не дошёл.

**– Сейчас ты часто судействуешь в областной Лиге КВН. Не возникало желания собрать команду жюри и выйти на сцену?**

Да, естественно, такое желание возникало, но нет возможности. Всё та же нехватка времени, да и для подготовки нужно много креативно мыслить, а это всё уходит в основную работу. Но может быть когда-нибудь...

**– Креатив, значит, весь на радиоэфир. А вот если бы ты не попал тогда на ТРК? На руках диплом иняза. Что дальше?**

– Ой, знаете – я бы с лёгкостью пошёл работать в школу, и даже не обязательно городскую. У меня был бы большой деревенский дом, кот, собака, корова… Мы бы с ребятами ходили в походы. Обязательно нашёл бы себе дополнительное занятие. Был бы первый парень на деревне!

**– А как тебе полученные знания сейчас помогают в жизни?**

– Помогают больше именно университетские знания, а не конкретно инязовские. Гуманитарные знания гораздо лучше технических, где профиль очень узок.

Именно языки? В командировках различных я свободно могу общаться на английском и немецком. Постоянно стараюсь совершенствоваться – читаю классическую английскую литературу, перелистываю словари, учебники. По роду деятельности мой словарный запас должен быть богатым.

**– У студентов сессия. А у тебя были какие-нибудь свои способы удачной сдачи?**

– Обаятельная улыбка! Педагоги у нас были преобладающе женского пола, но, к сожалению, улыбка не всегда работала.

На конспектах спал. А ещё был интересный случай. Мы сдавали латинский язык. Девочки-соседки по общежитию уже сдали этот экзамен и вызвались помочь в подготовке. Таня мне читала материал, а я, сидя рядом, уснул у неё на плече: был 3-й час ночи. Таня продолжала читать. Утром прихожу на экзамен, тяну билет и понимаю, что этот материал в глаза не видел. Посидел пару минут и вспомнил! Мне Таня это читала, когда я спал!

**– Пересдачи были?**

– Были. Во многом на исход экзамена влияет работа в течение всего семестра. Только спустя время начинаешь понимать, что преподаватели-то все видят. А студенты иногда себя так ведут… Сам такой был. Каюсь! И со всеми при встрече здороваюсь!

**– А какие воспоминания о преподавателях остались?**

*(Продолжение на странице 8)*

НАГОДА

# ЛЮБИМЫЙ ПРАЗДНИК ДЛЯ ЛЮБИМЫХ

**14 февраля многие люди по всему миру отмечают День святого Валентина, или День влюблённых. Существует несколько легенд, связанных с этим праздником – каждая, конечно, о любви.**

ЛЕГЕНДА 1 – о небезызвестном теперь всем священнике и враче Валентине, тайком освящавшем брак влюблённых. Когда священника «проделки» стали известны, власти бросили его в тюрьму, где Валентин влюбился в дочь надзирателя и вылечил её от слепоты. Перед смертью Валентин написал девушке прощальное любовное письмо – валентинку. В тот же день (14 февраля 269 года) его казнили.

ЛЕГЕНДА 2 – о добром друге маленьких детей Валентине. Он всегда был внимателен к ним, дарил подарки и сладости, рассказывал интересные истории. Однажды его оклеветали, и Валентин оказался в тюрьме. Дети, желая поддержать своего друга, бросали ему через прутья решётки маленькие записочки – валентинки.

ЛЕГЕНДА 3. В средние века во Франции жил рыцарь и поэт Джауфре Рюдель. Однажды он услышал от странников о красивейшей принцессе Триполитанской. Рыцарь, влюбившись, стал сочинять о прекрасной даме баллады и песни. Вскоре о них узнала принцесса и пригласила Джауфре к себе в гости. Однако на корабль, на котором плыл рыцарь, напали пираты. Спастись команде удалось, но во время боя Джауфре был тяжело ранен. Когда корабль приплыл в Триполитанскую гавань, умирающего рыцаря снесли на берег. Принцесса поспешила к поэту, но было поздно. Из руки Рюделя выпала записка с признанием в любви.

Так сказано в старинной летописи. Там же стоит и дата смерти Джауфре – 14 февраля 1148 года.

Все эти истории, как вы могли заметить, окутаны романтикой. Но интересно, что думают наши современники о этом празднике. Считают ли они его праздником вообще?



**Анастасия Любовицкая** (юридический факультет):

– Для меня это повод встретиться с друзьями. Очень люблю дарить и получать валентинки.



**Дмитрий Логинов** (биологический факультет):

– В этот день можно, наконец, осмелиться и выразить чувства любимому, самому дорогому человеку.



**Мария Буховецкая** (юридический факультет):

– День святого Валентина ассоциируется с яркими красками, сердечками, улыбками, солнышком (хоть на дворе и зима) и искренними чувствами. 14 февраля – самый лучший день зимы. Главное, чтобы любимый человек был рядом.

*Е. Басалай (биологический факультет)*

*В **США** Традиция празднования праздника была перенята у британских поселенцев в 19-м столетии. В честь Дня святого Валентина по всей стране организуются ужины и танцевальные вечеринки. Дети дарят подарки ручной работы своим друзьям и учителям.*

*Во **Франции** влюблённые дарят друг другу валентинки со стихами собственного сочинения.*

***Англичане** дарят валентинки своим питомцам.*

*В **Италии** влюблённые дарят друг другу сладости и называют День святого Валентина «Сладким днём».*

*В **Японии** существует целых две даты для праздника всех влюблённых. 14 февраля девушки и женщины дарят подарки своим возлюбленным, а 14 марта – юноши и мужчины. В качестве подарков чаще всего выступает шоколад. Один тип шоколада – «giri-choco» – покупается для друзей, коллег и начальников, другой – «hon-mei» – для любимых.*

*Кроме того в Японии в День святого Валентина проводят конкурс на самое громкое романтическое послание.*

# НАРОДНЫЙ ДИ-ДЖЕЙ

*(Начало на странице 7)*

– Ой, разные! Были такие, у кого на парах возникало желание заняться чем-то левым. А были и такие, кому ещё раз хочется сказать огромное спасибо, – Т.С. Троцюк, А.Е. Саиди, Д.В. Архипову, Ст.Г. Рачевскому, А.Н. Гарбалеву. Эти люди сыграли очень важную роль в моей жизни.

**– И напоследок пожелай что-нибудь университету, преподавателям и студентам.**

– Хотелось бы пожелать, чтоб не забывали друг о друге, чтобы позитивные отношения, сложившиеся между студентами и преподавателями в стенах университета, не заканчивались за пределами этих стен. Очень хочется, чтобы студентов пускали гулять в этом саду возле корпуса № 1 *(смеётся. – Авт.)*. А ещё – чтобы в общежитие пускали в любое время.

И хотелось бы, чтобы не забывались сложившиеся уже давно традиции.

*М. Кравчук (юридический факультет)*

**«Берасцейскі універсітэт» № 10 (130)**

**Рэдакцыя:** рэдактар – І.А. Хоміч (тэл. 23–01–29).
Фота – А. Макейчык, Р.У. Хрыстафораў.
Карэктар – К.В. Каханчык.
Куратар – Л.А. Гадуйка.
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме PВА БрДУ імя А.С. Пушкіна, 224665, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21.

Надрукавана на рызографе БрДУ імя А.С. Пушкіна.
224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28.
E-mail: gazeta_brsu@brsu.brest.by.
Падпісана ў друк 11.02.2010.
Аб'ём 1 ум. друк. арк. Тыраж 299 экз. Заказ № 53.
Рэдакцыя можа не падзяляць пункт погляду аўтараў артыкулаў.

***Газета запрашае да супрацоўніцтва студэнтаў, выкладчыкаў і спецыялістаў універсітэта***